

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 11 (203) 9 чэрвеня 1993 года, серада


## НАВІНЫ

### Ідуць уступныя экзамены

1 чэрвеня пачаліся ўступныя экзамены ў наш універсітэт на завочную форму навучання. На 325 месцаў прэтэндуе 435 чалавек. Больш за ўсё заяў паступіла на факультэты педагогікі і методыкі пачатковага навучання, беларускай філалогіі і культуры, правазнаўства.

Папярэдні аналіз паказвае, што на першы курс паступаюць добрападрыхтаваныя абітурыенты. Заканчваецца здача экзаменаў 15 чэрвеня.

**Л. БАБРОЎНІК.**

### Гісторык — доктар навук

Аляксандр Мікалаевіч Нечухрын працуе загадчыкам кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў на гістарычным факультэце. Шмат гадоў займаецца ён навуковай дзейнасцю ў галіне гістарыяграфіі. Яго распрацоўкі, і ў прыватнасці манаграфія «Змена парадыгмаў у рускай гістарыяграфіі ўсеагульнай гісторыі (90-я гады XIX ст.— 1917 г.)» ляглі ў аснову доктарскай дысертацыі, якую ён нядаўна з поспехам абараніў у Белдзяржуніверсітэце.

Рэдакцыя далучаецца да шчырых віншаванняў А. М. Нечухрына з нагоды прысуджэння яму вучонай ступені доктара гістарычных навук.

**М. МЯТЛЮК.**

### З пашанай да мовы

Чарговае пасяджэнне Тэрміналагічнага цэнтра адбылося 27 мая. З дакладам «Марфемнае словаўтваральнае ўнармаванне беларускай мовы» выступіў старшыня цэнтра прафесар П. Сцяцко.

Затым былі разгледжаны канкрэтныя пытанні гуманітарнай тэрміналогіі.

**С. ПАЎЛАЎ.**

### Шлях да ўзаемнасці

Па такой тэме 21—22 мая ў г. Беластоку праходзіла міжнародная навуковая канферэнцыя.

На канферэнцыі выступілі пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы Ул. Сянько, прадстаўнік урада Беларусі, а таксама намеснік міністра культуры Польшчы і іншыя афіцыйныя асобы.

Былі зачытаны прывітанні ўдзельнікам канферэнцыі ад прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь В. Кебіча, міністра інфармацыі А. Бутэвіча, польскіх афіцыйных уладаў, ваяводы г. Беластока і іншых.

З дакладамі на канферэнцыі выступілі 34 чалавекі. Апрача пленарных паседжанняў, працавалі дзве секцыі: мовы і літаратуры, гісторыі і культуры.

Ад Гродзенскага універсітэта ў канферэнцыі прынялі ўдзел 5 чалавек. З дакладамі выступілі прафесар С. Габрусевіч — «Супрацоўніцтва Гродзенскай суполкі БФК і Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы: праблемы і перспектывы», загадчык кафедры мовазнаўства прафесар П. Сцяцко — «Беларуска-польскія кантакты ў галіне матэрыяльнай культуры і іх адлюстраванне ў народнай мове Гродзеншчыны», загадчык кафедры беларускай культуры прафесар А. Пяткевіч — «Праблемы школьніцтва нацыянальных меншасцяў у Беларусі і Польшчы», загадчык кафедры польскай літаратуры і культуры дацэнт С. Мусіенка — «Падрыхтоўка настаўнікаў польскай мовы і літаратуры на Беларусі: праблемы і перспектывы», загадчык кафедры беларускай літаратуры дацэнт К. Лецка — «Навуковая канцэпцыя даследавання Базыля Кавалевіча. Беларуская рамантычная літаратура на старонках газеты «Кур'ер літаратурна-навуковы».

Шмат было дакладчыкаў і з г. Мінска.

Напрыканцы канферэнцыі яе ўдзельнікі наведалі г. Гайнаўку, дзе азнаёміліся з беларускім ліцэем, з царквою св. Мікалая.

На заключным пасяджэнні было вырашана наступную канферэнцыю па згаданай праблеме правесці на Беларусі.

**П. СЦЯЦКО.**

### Прысвоена званне прафесара

Атэстацыйная камісія прысвоіла вучонае званне прафесара доктару фізіка-матэматычных навук Аляксандру Антонавічу Пякарскаму. Яго імя добра вядома ў матэматычных колах не толькі Беларусі, але і за мяжой.

Далучаемся да віншаванняў і зычым навукоўцу новых творчых поспехаў.

**К. ВЕРБАВА.**

## Літаратура яднае народы

**26—29 мая у нашым універсітэце прайшла навукова-тэарэтычная канферэнцыя «Узаемадзеянне літаратур у сусветным літаратурным працэсе». У ёй прынялі ўдзел навукоўцы Гродзенскага універсітэта, а таксама літаратуразнаўцы з Мінска, Гомеля, Віцебска, Мазыра, Брэста, Днепрапятроўска.**

**Канферэнцыю адкрылі першы прарэктар А. І. Васкабоеў і дэкан філалагічнага факультэта М. І. Канюшкевіч, якія павіталі ўдзельнікаў канферэнцыі і пажадалі ім пленных навуковых зносін.**

**На пленарным пасяджэнні прагучала 5 дакладаў, праблематыка якіх адлюстроўвала асноўныя напрамкі кампаратыўных даследаванняў. І. В. Шаблоўская ў сваім канцэптуальным дакладзе, ў якім былі выказаны слушныя прапановы па развіццю беларускай кампаратывістыкі, спынілася на праблеме ўспрымання замежных літаратур у беларускай літаратурна-мастацкай свядомасці.**

**Значную цікавасць выклікаў даклад В. Л. Калашнікавай, які быў прысвечаны руска-французскім літаратурным сувязям XVIII ст. Аўтар даклада прадэманстравала сам працэс трансфармацыі літаратурных уздзеянняў у арыгінальна-самабытную літаратурную творчасць.**

**Вялікую цікавасць выклікалі таксама даклады С. А. Лысенка аб тыпалагічнай агульнасці ўкраінска-рускай драматургіі 20-х гг. нашага стагоддзя і Г. П. Тварановіч — аб адносна маладаследаваных беларуска-паўднёваславянскіх узаемаадносінах.**

**На другі дзень работа канферэнцыі была працягнута ў секцыях.**

**(Матэрыялы канферэнцыі чытайце на 2-й стар.).**




**На здымку: удзельнікі канферэнцыі. Фота У.САРОКІНА.**

*Інтэрв'ю ў нумар*

## ПРЫЕМНЫЯ ЎРАЖАННІ

ДОКТАР ФІЛАЛАГІЧНЫХ НАВУК, ПРАФЕСАР В. Л. КАЛАШНІКАВА (ДНЕПРАПЯТРОЎСК)

**— Вашы ўражанні ад канферэнцыі!**

*— Уражанні вельмі прыемныя. Нечакана для сябе... Між іншым, чаму нечакана? Па навуковых працах я даўно знаёма з гродзенскімі даследчыкамі, і праз гэты інтарэс ўзнікла жаданне прыехаць на канферэнцыю. У Беларусі я ўпершыню і вельмі рада, што маё знаёмства з краінай пачалося з Гродна, з Гродзенскага універсітэта, дзе працуе група арыгінальна думаючых вучоных, якія ўвогуле не адчуваюць сябе ў інтэлектуальнай аддаленасці ад цэнтраў сучаснай навукі і якія працуюць над самымі актуальнымі, самымі цікавымі праблемамі.*

*Горад Гродна пакарыў мяне як горад са старажытнай гісторыяй, у якой пераплятаюцца шляхі розных народаў. І заканамерна, што такая навуковая — на высокім узроўні праведзеная — канферэнцыя адбылася менавіта тут. Хочацца верыць, што гэта канферэнцыя — толькі пачатак будучай традыцыі рэгулярных сімпозіумаў вучоных розных краін.*

**— Вашы пажаданні!**

*— Зараз і Украіна, і Беларусь уступілі ў перыяд актыўнага пошуку міжнародных кантактаў, і хацелася б, каб сярод мноства новых кантактаў не страціліся папярэднія сувязі і каб славянскія народы, адчуваючы кожны сваю самабытнасць, не страцілі патрэбнасці ва ўзаемаўзбагачальных зносінах.*

## ВАЖНЫЯ ПЫТАННІ

Надзвычай важныя для жыцця універсітэта пытанні абмеркавала на сваім апошнім пасяджэнні Вучоная рада. Адбылося зацвярджэнне вучэбных планаў факультэтаў, зроблены аналіз камерцыйнай дзейнасці універсітэта.

Члены рады разгледзелі і зацвердзілі комплексны план выхаваўчай работы са студэнтамі.

Зацікаўленая размова ішла аб далейшым удасканаленні структуры універсітэта. Адзначалася, што перш за ўсё трэба ўдакладніць профіль універсітэта. Рэктарам А. В. Бадаковым прапанавана адкрыць падрыхтоўку спецыялістаў па замежных мовах; на базе завочнага аддзялення адкрыць падрыхтоўку гувярнёраў і сямейных педагогаў; стварыць бізнес-каледж; рыхтаваць практычных псіхолагаў. На факультэце правазнаўства мяркуецца стварэнне новых структур. Стаіць на чарзе аб'яднанне двух філалагічных факультэтаў. Былі і іншыя прапановы. Але пачакаем да нечарговага пасяджэння Вучонай рады. Створана камісія па разгляду ўсіх прапаноў.

# ЛІТАРАТУРА ЯДНАЕ НАРОДЫ

## «Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай літаратуры»

Секцыя, прысвечаная праблематыцы беларускай літаратуры ў кантэксце літаратур краін свету, працавала, відаць, упершыню ў межах навуковых канферэнцый Беларусі. Як адзначалася ў дакладах, параўнальны падыход дазваляе лепш вывучыць і сваё нацыянальнае, беларускую літаратуру ў яе тыпалагічнасці з сусветнай, і адметнасці.

Дакладчыкі прадстаўлялі давольна шырока вузаўскае літаратуразнаўства Беларусі: тры універсітэты — Беларускі Гродзенскі, педагагічныя інстытуты (Мінск, Мазыр). Закранапі творчасць беларускіх пісьменнікаў розных стагоддзяў (ад Я. Лучыны да М. Багдановіча, ад Я. Купалы да І. Шамякіна і А. Разанава). Закраналіся праблемы ўзаемных уплываў, перакладаў, дакладчыкі звярталіся да падрабязнага аналізу асобных твораў беларускіх пісьменнікаў і замежных, іх праблематыкі і паэтыкі.

Аналіз верша Янкі Лучыны, прысвечанага стагоддзю з дня нараджэння Байрана, дазволіў паставіць праблему ўплыву творчай асобы вялікага англійскага паэта, рамантычнага ідэала ў іх прыцягальнасці (даклад К. І. Лецкі). Перакладчыцкая дзейнасць М. Багдановіча, даследаваная ў дачыненні да антычных аўтараў, навяла на роздум аб антычных узорах у яго творчасці, характэрнай сімволіцы і міфалагізму (даклад Д. М. Лебядзевіча). Згадаем пра сумны лёс беларускай культуры: М. Багдановіч чытаў антычных класікаў у арыгінале, а яго наследнікі не маглі. Чаму так? Ці беларусы не маглі вывучаць класічную філалогію ў сваіх ВНУ? Да гэтага часу ў нашых вну няма класічных аддзяленняў.

У дакладзе У. І. Каялы прагучалі вынікі руплівых доследаў у галіне беларускага перакладу баек І. А. Крылова. Тэкставы аналіз арыгіналу і розных варыянтаў яго гучання па-беларуску дапамог бачыць страты і знаходкі пры захаванні зместу і мастацкіх вартасцяў. Упершыню прагучалі пераклады Друцкага-Падбярэзскага, выдадзеныя ў Вільні ў 1926 годзе, імя якога не трапіла ні ў адзін з беларускіх даведнікаў, хаця ў беларускага перакладчыка Крылова быў выдадзены зборнік сваіх сатырычных вершаў. Так што навукова-даследчыцкі пошук працягваецца.

Большасць дакладаў была прысвечана пытанням руска-беларускіх і беларуска-рускіх суадносін, параўнальнаму аналізу твораў І. Тургенева і Я. Брыля. (даклад В. М. Вайлупавай); І. Мележа і Ф. Абрамава (даклад Л. І. Толчыкавай); Ф. Абрамава і А. Жука (даклад Т. М. Логвін), асэнсаванню творчасці І. Шамякіна ў кантэксце рускай сучаснай прозы (даклад Г. М. Дашкевіч). Глыбокім пранікненнем у творчую біяграфію майстроў беларускага прыгожага пісьменства вызначаліся даследаванні творчасці А. Разанава ў сувязі з пошукамі новых выяўленчых сродкаў (дакл. А. Э. Астравух) і Я. Брыля ў яго прыцягненні да асобы Л. М. Талстога (дакл. В. Б. Нікіфаравай).

Зацікаўленыя дыскусіі па праблемах рамантызму, лірычнай прозы, псіхалогіі жаночага характару, свабоды творцы, тэарэтычных аспектах кампаратывістыкі суправаджалі выступленні дакладчыкаў. Яны сведчылі аб тым, як рашуча пачало беларускае літаратуразнаўства пераадольваць каноны і стэрэатыпы часоў панавання афіцыйнай узаконенай дактрыны сацыялістычнага рэалізму, якая акцэнтавала этычныя, ідэалагічныя падыходы, сацыяльны аналіз і абвяшчала другараднымі ўсе астатнія метады і мастацкія пошукі.

Работа секцыі сведчыць як аб значных здабытках беларускіх літаратуразнаўцаў у галіне русістыкі з яе спецыфічнымі асаблівасцямі ўспрыняцця творчасці блізкага славянскага народу, так і аб увазе да адраджэння нацыянальнай ментальнасці і культуры. На гэтым шляху нас чакае вялікая сусветная літаратура ўсіх рэгіёнаў і краін, рэцэпцыя якой вялікі гонар кожнай нацыянальнай навукі, сведчанне яе культуры і цывілізаванасці. Зразумела, што наша беларуская славістыка, германістыка, арабістыка залежыць ад таго, як павернецца да яе вышэйшая школа, у першую чаргу універсітэты, дзе неабходна адкрываць — як мага хутчэй — новыя спецыялізацыі, якія дазволяць вывучаць мовы, літаратуры народаў свету ў шырокім культурным кантэксце, каб весці належную прафесійную падрыхтоўку перакладчыкаў мастацкай літаратуры.

**І. ШАБЛОЎСКАЯ.**

перарасло ўрэшце-рэшт у агульнасць творчых адкрыццяў двух самабытных паэтаў. Адной з цэнтральных праблем у рабоце секцыі стала творчасць А. Пушкіна як з пункту гледжання засваення традыцый заходнееўрапейскай літаратуры (Ягораў І. В., Фядута А. І.), так і ўспрыняцця Пушкіным антычнай літаратуры ў яе перакладах на рускую мову. Даклад Г. У. Ярмоленка, прысвечаны атрыбуцыі рэцэнзіі на пераклад «Іліады» Гамера Гнедзічам, з´явіўся цудоўным прыкладам комплекснага філалагічнага даследавання.

**І. ЯГОРАЎ.**

## «Праблемы рускай і замежнай літаратуры»

На пасяджэнні секцыі было прадстаўлена 5 дакладаў. Кожны з іх увабраў у сябе аналітычны падыход да даследуемага матэрыялу, глыбокае веданне фактаў і сур´ёзную метадалагічную падрыхтоўку.

Вельмі арыгінальны і практычна невядомы матэрыял быў прадстаўлены ў дакладзе А. С. Мітрапольскага, які прысвячаўся даследаванню архіваў М. Дабралюбава. Цікавы падыход да праблемы экзістэнцыяльнай філасофіі быў прапанаваны ў дакладзе А. Ю. Захарава.

Але трэба адзначыць, што не заўсёды паведамленні дакладчыкаў знаходзілі жывы водгук у слухачоў. Прычынай гэтага, мабыць, можна лічыць вельмі шырокі спектр тэм.

Дабавім, што даклады пераконваюць у прафесіянальным энтузіязме іх аўтараў.

**А. ЗАХАРАЎ.**

## «Праблемы параўнальна-гістарычнага вывучэння літаратур: тэарэтычны аспект»

Было прачытана 8 дакладаў. Тэматычны дыяпазон дакладаў вельмі шырокі: канцэпцыя асобы ў рускай і еўрапейскай літаратурах канца XIX — пачатку XX ст. (Л. С. Дарошка і А. Г. Ківака — Брэст), жанрава-тыпалагічныя аспекты драматургіі (С. Я. Ганчарова-Грабоўская, Г. Л. Нефагіна — Мінск), спецыфіка пафасу мастацкага твора і раман «прадбачання» (А. В. Карасева — Мінскі Л. І. Мурзіч — Гродна). Некаторыя даклады мелі характар пастаноўкі праблемы (А. В. Іваноў — МІнск, Т. У. Сянькевіч — Брэст).

Усе даклады былі па-свойму цікавыя. Трэба адзначыць высокі навуковы ўзровень паведамленняў. Дакладчыкам былі зададзены шматлікія пытанні па некаторых праблемах (у асноўным філасофскага характару), разгарнуліся дыскусіі. Работа секцыі была вельмі цікавай і творчай. Зносіны даследчыкаў паміж сабой дазвалялі пашырыць свой навуковы кругазор.

У заключэнне ўдзельнікі адзінадушна адзначылі добрую арганізацыю канферэнцыі кафедрай рускай і замежнай літаратуры. Прыемна, што правядзенне навуковых канферэнцый у ГрДзУ становіцца добрай традыцыяй, якая дазваляе абменьвацца вынікамі даследаванняў, падтрымліваць высокі навуковы тонус. Хацелася б, каб аналагічныя канферэнцыі праводзіліся і ў далейшым. Асаблівую ўдзячнасць ўдзельнікі секцыі прыносяць дацэнту кафедры рускай і замежнай літаратуры Т. Р. Сіманавай, ініцыятару канферэнцыі, чалавеку, які ўдыхнуў жывую душу ў сам замысел навуковых зносін беларускіх літаратуразнаўцаў.

**Г. НЕФАГІНА.**



## «Руска-заходнееўрапейскія літаратурныя сувязі »

Тэматыка дакладаў, прадстаўленых на гэтай секцыі, была надзвычай разнастайнай як па матэрыялу (руская і англійская, французская, нямецкая, лацінаамерыканская літаратуры), так і па прынцыпах даследавання, падыходу да яго. Літаратурнае ўздзеянне, тыпалагічная агульнасць, творчая палеміка — вось далёка няпоўны пералік аспектаў вывучэння ўзаемадзеяння рускай і заходнееўрапейскіх літаратур.

Асабліва вострую цікавасць выклікаў даклад Г. В. Сініла «Рильке и Пастернак», які злучыў асвятленне малавывучаных фактаў біяграфіі рускага паэта і даследаванне творчага ўздзеяння Рыльке на Пастэрнака, якое

## Інтэрв ´ю ў кулуарах

**Доктар філалагічных навук прафесар І. В. Шаблоўская (БДУ).**

**— Вашы ўражанні ад канферэнцыі!**

*— Канферэнцыя пакінула вельмі прыемнае ўражанне. Чаму? Таму, што гэта першая ў гісторыі беларускага літаратуразнаўства канферэнцыя па ўзаемасувязях. Прыемна, што яна прайшла ў вашым маладым універсітэце, які пераняў у дадзеным выпадку традыцыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, дзе такія канферэнцыі праводзіліся на працягу 70-х гадоў.*

*Канферэнцыя пабуджае паставіць некаторыя пытанні. Я лічу, што вольная Беларусь павінна развіваць уласную літаратуразнаўчую навуку ва ўсіх напрамках. Для чаго патрэбна праводзіць такія канферэнцыі рэгулярна. Таму пажадана, каб гэтыя канферэнцыі замацаваліся за ГрДзУ як фактар навуковых зносін. Перспектыўным у гэтай сувязі з´яўляецца тое, што ў ГрДзУ адкрываюцца новыя спецыялізацыі, у прыватнасці, паланістыка. Неабходна вам, філолагам, і нам працаваць у гэтым накірунку, адкрываць іншыя спецыялізацыі: па славістыцы, па рамана-германскай філалогіі, рыхтаваць спецыялістаў па класічных мовах.*

*Яшчэ раз падкрэслю, што Беларусь як свабодная, незалежная дзяржава павінна мець уласныя кадры. Неабходна развіваць і ўласную беларускую арыенталістыку: кожны беларус павінен мець патэнцыяльную магчымасць вывучаць мову і культуру народаў усяго свету, у прыватнасці Японіі, Індыі, Кітая і г. д. Безумоўна, стварэнне беларускай арыенталістыкі пытанне часу, але ж калі-небудзь трэба пачынаць.*

*Аглядваючы гэтыя задачы, прыходзіш да думкі аб тым, што беларуская літаратуразнаўчая навука, на жаль, пакуль што знаходзіцца ў загоне, таксама як і гуманітарная адукацыя ў цэлым. Няма выданняў па капаратывістыцы, няма іншамоўных даследаванняў. Між іншым, для нацыі гэта вельмі важна.*

*Неабходна развіваць універсітэты як цэнтры навукі і культуры. Ва ўсім свеце ўзровень цывілізаванасці нацыі вызначаецца ўзроўнем універсітэцкай навукі. Чаму, напрыклад, ва універсітэце чэшскага горада Карлавы Вары штогод каля 8 студэнтаў вывучаюць беларускую мову і культуру? Чаму нашы беларускія хлопцы і дзяўчаты пазбаўлены гэтай магчымасці вывучаць любую мову свету?*

*Я лічу, што няма неабходнасці даказваць, што ў цывілізаванай нацыі павінна быць развіта ўяўленне пра ўсе культуры праз прызму сваёй нацыянальнай ментальнасці. Свае праз чужое, чужое — праз свае — гэта неабходная ўмова нацыянальнага самавызначэння. Вось чаму, я лічу, было б злачынствам абмяжоўваць русістыку, але поруч з русістыкай неабходна развіваць і іншыя кірункі філалагічнай навукі. Увесь мастацкі вопыт сусвету патрэбен беларусам сёння.*

*Як яшчэ адна частка гэтай складанай задачы развіцця беларускага літаратуразнаўства—неабходнасць стварэння сваёй Рады па абароне дысертацый. Усё гэта вельмі важна, бо філалогія, у цэлым гуманітарная навука, іграе вялікую ролю ў фарміраванні і памнажэнні духоўнага патэнцыяла асобы і нацыі.*

*І апошняе. Я хачу адзначыць вельмі высокі навуковы ўзровень канферэнцыі. Увогуле, у горадзе ведаюць і любяць свой універсітэт. Сапраўды, Гродна — універсітэцкі горад. Можа, гэтаму спрыяюць касмічныя сілы. Не забудзьце: Гродна — амаль што геаграфічны цэнтр Еўропы, таму заканамерна, што канферэнцыя па ўзаемасувязях літаратур прайшла менавіта ў вашым горадзе, дзе ёсць свае традыцыі, перш за ўсё традыцыя суіснавання прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, канфесій, культур.*

## *Удзельнікі канферэнцыі — у люстэрку эпіграм*

**Г. В. ЕРМОЛЕНКО.**

Он с математикой дружил,
Но как-то проявил беспечность:
Восьмерку боком положил—
И получилась бесконечность.
Но результат зато упрочен
Линвостатистики трудом,
И посвящен солидный том
Сопоставленью двоеточий.

**О. Л. КАЛАШНИКОВОЙ**

Профессор из Днепропетровска
Одета не очень броско,
Но чувствуешь вкус,
И сражен весь Союз
Милой дамой из
Днепропетровска.
О российских и об иностранных
Говорила професор романах,
Комаров и Прево,
И Чулков с Мариво
Вдруг в глазах заплясали
канканом.

**И. В. ЕГОРОВУ**

Откуда брался пыл его?
С энергией и прилежаньем
Он занялся (но отчего?)
Веселым делом созиданья.
Стило — как мастерок в руке,
И созидает автор верно
Воздушный замок на песке
В согласии с проектом Стерна.

**Т. В. КОВАЛЕВОЙ**

Был труд ее и кропотлив,
и сложен:
Листок на две колонки
расчертив,
Она смогла исследовать дотошно
В двух повестях и фразу,
и мотив.
И среди всех ее словесных
кружев
Идея посетила нас одна:
Какая разница — Жорж Санд
или Бестужев?
Ведь оба были все равно
в штанах.

**Т. Е. АВТУХОВИЧ**

Седина пробивается в волосе,
Воцарилось волнение в голосе,
В голове Аввакум или Полоцкий,
К сожалению, нам не понять.
Позже будут культуры историки,
Разгребая обломки риторики,
Все дорожки, что ею проторены,
Очень долго искать.
А пока — Древней Руси эмоции,
В водах моря Житийного
лоции,
Старых «Слов» синкретический
звон.
Все равно разобраться
в предложенном,
Осознать глубину мы не можем.
Лишь
Лихачев. Только он.

**Г. В. СИНИЛО**

Она парит. Со взмахом крыльев
Опора из-под ног ушла.
А Пастернак, Марина, Рильке—
Как перья из ее крыла.
Поэт лишь инструмент для Бога.
У каждого своя судьба:
Вы — словно скрипка-недотрога,
Я — Ерихонская труба.

**Автор эпиграмм**
**А. ФЕДУТА.**

Матэрыялы аб канферэнцыі падрыхтавала дацэнт кафедры рускай і замежнай літаратуры **Т. Я. АЎТУХОВІЧ.**

*Юрыдычная даведка*

## Новыя памеры платы за навучанне

31 мая г.г. выдадзены загад рэктара за № 326 «Аб арганізацыі прыёму студэнтаў, якія будуць займацца на дагаворнай падставе, і аб устанаўленні платы за навучанне ў 1993/94 навучальным годзе».

Згодна з загадам, для студэнтаў, якія заключаюць дагаворы аб набыцці першай (другой) вышэйшай адукацыі пасля 1 чэрвеня г.г. устаноўлены наступныя памеры платы за навучанне:

1. Для грамадзян Рэспублікі Беларусь: **педагагічныя спецыяльнасці** — 50 000 рублёў (завочная форма навучання); 100 000 рублёў (дзённая форма);

юрыдычныя, эканамічныя, інжынерныя спецыяльнасці: 100000 рублёў (завочная форма); 200 000 рублёў (дзённая форма).

Для грамадзян іншых дзяржаў СНД памеры платы такія:

**на юрыдычныя, эканамічныя, інжынерныя спецыяльнасці** — 200 000 рублёў для завочнікаў, 300 000 рублёў для вячэрнікаў і 400 000 рублёў (дзённая форма навучання).

Зменены памер платы і для тых студэнтаў, якія заключылі дагаворы аб набыцці першай (другой) вышэйшай адукацыі да 1 чэрвеня г.г. Так, грамадзяне нашай рэспублікі павінны заплаціць за навучанне **юрыдычным, эканамічным, інжынерным спецыяльнасцям** — 90 000 рублёў (завочнікі), 140000 рублёў (вячэрнікі) і 180000 рублёў на дзённым навучанні. Для грамадзян іншых краін — адпаведна 180 000, 270 000 і 360000 рублёў.

У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, заключэнне індывідуальных дагавораў аб падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй будзе праводзіцца толькі з асобамі, якім на дзень падачы дакументаў споўнілася 18 гадоў.

З 1 чэрвеня ўведзены новыя памеры платы за пераводы і ўзнаўленне, а таксама за ліквідацыю запазычанасці і розніцы ў вучэбных планах пры ўзнаўленні, пераводзе студэнтаў або па іншай прычыне. Так, за пераздачу экзамена (заліку), залічэнне курсавой працы трэба будзе заплаціць 3000 рублёў, за пераздачу дзяржаўнага экзамена, залічэнне дыпломнай працы — 6000 рублёў.

## Якая зараз стыпендыя?

**Пастановай урада Рэспублікі Беларусь № 324 ад 17.05.1993 г. з 1 чэрвеня г.г. уведзены новыя памеры дзяржаўных стыпендый.**

**Студэнты нашага універсітэта, якія паспяхова вучацца, будуць атрымліваць яе ў памеры 85 працэнтаў мінімальнай заработнай платы (а яна, як вядома, складае зараз 6500 рублёў).**

**Студэнты-матэматыкі атрымаюць 105 працэнтаў мінімальнай заработнай платы, незалежна ад курсу навучання.**

**Для тых студэнтаў, якія па выніках экзаменацыйнай сесіі маюць толькі добрыя, а таксама добрыя і выдатныя адзнакі, памер стыпендыі павялічыцца на 20 працэнтаў, а якія маюць толькі выдатныя адзнакі — на 40 працэнтаў ад устаноўленых памераў.**

**А. БЕЛАВУСАЎ,**
**начальнік аддзела міжнародных сувязяў, маркетынгу і права.**





**Кафедра музычнага выхавання, якую ўзначальвае В. А. Місцюк, вельмі многае робіць па навучанню студэнтаў асновам музыкі, прывівае ім пачуццё Прыгожага.**

**У гэтыя дні выкладчыкі прымаюць экзамены і залікі ў студэнтаў факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання.**

**На здымку справа: заняткі па дырыжыраванню праводзіць Г. М. Крыжаноўская; урок па валялу вядзе Л. І. Дзюбіна.**

**Фота У. САРОКІНА.**

# «Кніга «Памяць» павінна застацца нашчадкамі», — лічыць прафесар І. П. Крэнь

**У вобласці працягваецца работа над напісаннем гісторыка-дакументальных хронік «Памяць». Актыўны ўдзел у гэтай высакароднай справе прымаюць навукоўцы ВНУ г. Гродна.**

**Мы звярнуліся да аднаго з самых актыўных членаў аўтарскага калектыва, члена абласной камісіі, загадчыка кафедры гісторыі Беларусі прафесара І. П. Крэня з просьбай падзяліцца думкамі аб ходзе падрыхтоўкі матэрыялаў хронік.**

**— Іван Платонавіч, у народзе вельмі прыхільна сустрэлі саму ідэю стварэння хронік «Памяці». Гэта даніна ўдзячнасці нашым продкам, імкненне захаваць для будучых пакаленняў гісторыю Бацькаўшчыны. Пахвальна, што вучоныя Гарадзеншчыны першымі ўключыліся ў гэтую высакародную справу. Скажыце, што канкрэтна ўжо зроблена, над чым працуеце Вы зараз?**

— Праца над дакументальнымі хронікамі «Памяць» вядзецца даўно, і ў тым ліку на Гродзеншчыне. Наша кафедра прымае ўдзел у такой высакароднай справе з 1988 года. Гэта адна з тэм рэспубліканскіх навуковых праграм, якія курыруе кафедра.

Што ўжо зроблена? Дацэнты кафедры У. А. Нядзелька і У. Я. Ягорычаў завяршылі падрыхтоўку хронікі па Гродзенскаму раёну. Гэтая кніга выйдзе ў хуткім часе ў выдавецтве. Узначальваў аўтарскі калектыў прафесар сельгасінстытута У. П. Верхась. Увогуле, мы павінны быць удзячнымі Уладзіміру Паўлавічу за тое, што ён на Гродзеншчыне распачаў гэту сумленную працу, і ўсе аўтарскія калектывы ад яго многае ўзялі.

Самая галоўная кніга, над якой працуе ўся кафедра і прадстаўнікі іншых кафедраў гістарычнага факультэта — і не толькі яго — гэта кніга пра г. Гродна.

Акрамя таго, на сённяшні дзень завершана практычна праца над кнігай пра Дзятлаўскі раён, дзе працавалі дацэнты І. А. Фёдараў з кафедры гісторыі Беларусі і Я. А. Місарэвіч з сельгасінстытута. Кніга павінна ўбачыць свет у канцы бягучага — пачатку наступнага года. Хутка будзе здадзена ў выдавецтва кніга «Памяць» пра Іўеўскі раён. Непасрэдны ўдзел у яе падрыхтоўцы прымалі дацэнт М. В. Васілючак і я. Засталося падабраць некаторыя дакументы, удакладніць факты і лічбы.

У выдавецтве знаходзіцца і рукапіс кнігі пра Карэліцкі раён, навуковым кансультантам якой з´яўляецца дацэнт Б. М. Іванчук. Завяршаецца падрыхтоўка хронікі па Навагрудскаму раёну, у якой удзельнічаюць прафесар М. В. Жарскі і дацэнт І. А. Басюк.

... Удзел нашых навукоўцаў у гэтай высакароднай справе шматтранны: яны ўваходзяць у склад камісій, рэдакцыйных калегій, пішуць планы-праспекты, навуковыя артыкулы, падбіраюць разам з архівамі і музеямі дакументы. Але галоўнае прызначэнне навукоўцаў — забяспечыць навуковы змест выданняў гэтай серыі.

У апошні час члены нашай кафедры і іншыя навукоўцы працуюць над хронікамі па Смаргоні і Смаргонскаму раёну (прафесары І. П. Крэнь і І. І. Коўкель), Лідскаму раёну (У. П. Верхась, І. І. Коўкель і М. В. Васілючак).

Прыступіў да працы над кнігай у Воранаўскім раёне дацэнт Э. С. Ярмусік.

Нядаўна звярнуліся да нас Бераставіцкі і Ваўкавыскі раёны, і мы акажам ім усю неабходную дапамогу.

Што тычыцца іншых раёнаў нашай вобласці, як, напрыклад, Астравецкі, Зельвенскі, Ашмянскі, то яны інтэнсіўна супрацоўнічаюць з навукоўцамі з Мінска.

Так, пра Астравецкі раён піша кнігу іх знакаміты зямляк А. І. Мальдзіс, Слонімскі — загадчык аддзела інстытута гісторыі АН Беларусі П. А. Лойка і г. д.

**— У гістарыяграфіі ідзе зараз перагляд навуковых пазіцый, поглядаў на тыя ці іншыя падзеі, адбываецца адыход ад ідэалагічных догм і аднабаковасці. Ці ўласцівы новыя падыходы да гісторыі членам аўтарскіх калектываў і ў чым яны праяўляюцца?**

— Змена палітычнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь пасля распаду Саюза ССР і абвяшчэння незалежнасці Беларускай дзяржавы, вядома, не магло не адбіцца на змяненні падыходаў і ацэнак, перагляду некаторых палажэнняў у беларускай гістарыяграфіі. Ды і сам навукова-метадычны цэнтр, які накіроўвае ў рэспубліцы падрыхтоўку рукапісаў «Памяць», таксама пераглядвае ўстаноўкі і рэкамендацыі, якія выдае аўтарскім калектывам. За апошнія 5 гадоў ён тройчы выдаваў метадычныя рэкамендацыі, у якіх карэнным чынам змяняўся падыход да зместу гэтых хронік. Калі раней галоўнае месца ў іх адводзілася савецкаму перыяду, у першую чаргу звязанага з Вялікай Айчыннай вайной, што цяпер храналагічныя рамкі значна пашырыліся — ад старажытных часаў да сённяшняга дня. І больш увагі рэкамендуецца надаваць дасавецкаму перыяду, уключаючы ў кнігу «Памяць» усіх і ўсё (людзі, помнікі гісторыі і культуры, хроніка важнейшых падзей і г. д.), што заслугоўвае нашай з вамі памяці. Практычна сёння гісторыка-дакументальныя кнігі «Памяць» ператвараюцца ў энцыклапедыі таго ці іншага горада і раёна.

Вялікія патрабаванні ставяцца да тэксту, яго мовы, стылю. Трэба не толькі сказаць і пацвердзіць дакументамі факты, але і сказаць аб гэтым цікава, узнёсла, каб кнігу гэтую з прыемнасцю мог кожны ўзяць у рукі і прачытаць.

Таму аўтарскія калектывы ўлічвалі гэтыя змены. Але ў сувязі з гэтым павінен сказаць: тыя рукапісы, якія рыхтуюцца з удзелам Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта і іншых ВНУ нашага горада, адпавядаюць гістарычнай праўдзе, якой бы яна ні была. І гэта галоўнае, бо дакументальная аснова важнейшая ў кнізе, на ёй ствараецца памяць.

**— Ідучы па такому шляху, вы не маглі не адчуць пэўных цяжкасцяў з падборам матэрыялаў. Што перашкаджала ў працы, як пераадольваўся маральны і псіхалагічны бар'ер, закрытасць архіўных сховішчаў?**

— Цяжкасці узаемазвязаны як раз з тымі зменамі, якія адбываюцца ў рэспубліцы і Гродне. З аднаго боку яны аблегчылі працу, з другога — ускладняюць яе, бо трэба шукаць адпаведныя дакументы ў архівах, фондах музеяў. У пры выкарыстанні ўжо ўведзеных у абарот дакументаў трэба па-новаму іх трактаваць у сувязі з патрабаваннямі часу.

І яшчэ. Пераход да рыначнай эканомікі ўскладніў і пошук дакументаў. Калі раней аўтарскія калектывы маглі атрымаць у архіве патрэбны ім дакумент бясплатна, то цяпер за ўсё трэба плаціць. А цэны катастрафічна растуць. Гэта па-першае.

Па-другое, частка дакументаў знаходзіцца па-за межамі Беларусі — у тым ліку ў Вільнюсе, Санкт-Пецярбурзе, Кіеве, Маскве, у заходнееўрапейскіх краінах. Доступ да іх няпросты.

Вядома, што ўсе мы жывём надзеяй на вяртанне гэтых дакументаў на радзіму, як вяртаецца да нас з Кіева, напрыклад, знакамітая бібліятэка Храбтовічаў. Але да ўсяго гэтага трэба намаганні людзей і час. А час не церпіць.

І па-трэцяе — узнікаюць цяжкасці, асабліва ў г. Гродне і некаторых іншых гарадах вобласці, у выяўленні прозвішчаў людзей, якія закатаваны фашыстамі ў канцлагерах, гета. Спісы загінуўшых, пры ўсёй, здавалася б, нямецкай педантычнасці, не захаваліся.

Ёсць цяжкасці і ў выяўленні прозвішчаў байцоў Савецкай Арміі, якія загінулі ў часы адступлення і пры вызваленні нашых гарадоў. Больш таго, ёсць звесткі, што знаходзяцца людзі, якія жадаюць нажыць капітал на гэтай справе, патрабуючы за прадастаўленне даных вялікую суму грошай.

Не ўсё проста з падрыхтоўкай фотаілюстрацый, картаў і схемаў да кніг, а без іх, як вядома, добрая рэч не атрымаецца. Як не дзіўна, большасць нашых аўтараў слаба валодаюць беларускай мовай. А пераклад, друкаванне дорага каштуюць, і падчас цяжка знайсці дасведчанага чалавека, які напісаў бы той ці іншы артыкул. Так, у Гродне не магу знайсці аўтара, які напісаў хаця б кароткі нарыс пра гродзенскую яўрэйскую абшчыну. І такіх прыкладаў шмат.

**— Але, відаць, надзею не страчваеце, глядзіце ў перспектыву?**

— Я ў гэтым сэнсе аптыміст. Цяжка пачынаць, але калі праца прыносіць задавальненне, спыняцца грэх. Паўтаруся: праз месяц-другі закончым кнігі пра Гродна, Дзятлаўскі і Іўеўскі раёны. Плануем у гэтым годзе здаць хронікі Смаргонскага і Навагрудскага раёнаў. Паскорваецца праца ў Шчучынскі, Лідскім раёнах.

Мяне радуе і тое, што 50 працэнтаў выдаткаў па падрыхтоўцы і выданню кніг бярэ на сябе дзяржава. Ды і свет не без добрых людзей. Пералічваюць грошы на выданне хронік многія працоўныя калектывы, асобныя людзі. У раёнах вырасла шмат добрых арганізатараў, якія на грамадскіх пачатках збіраюць матэрыялы, наведваюць архівы, рыхтуюць нарысы.

**— І дзе, на Вашу думку знойдуць прымяненне кнігі «Памяць»?**

— Па-першае, яны зберагуць для навукі, для гісторыі, нашчадкаў нашых усё самае каштоўнае, што ёсць у гісторыі кожнага горада ці раёна. Па-другое, яны шырока будуць выкарыстоўвацца ў падрыхтоўцы калектыўных прац па гісторыі, краязнаўству Беларусі, у навучальным працэсе ВНУ, тэхнікумаў, школах, ПТВ, у выхаваўчай рабоце з людзьмі.

**Інтэрв´ю правёў У. АМЕЛЬКА.**

